Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
___________Ж.Л.Раманава
“__”__________2023 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
___________Ю.М.Галкоўская
“__”__________2023 г.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ **“ГЕНДЭРНАЯ ГІСТОРЫЯ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ”**

для студэнтаў спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)

Складальнік: Л.У.Ландзіна, доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта “21” 03 2023 г. пратакол № 7

**ЗМЕСТ**

1. Уводзіны. С.3–5
Тэматычны план С.6

2. Тэарэтычны раздзел
– вучэбныя выданні С.7-8
– план-каспект лекцый С.9–19
–іншыя матэрыялы (навуковая літаратура) С. 20–27

3. Практычны раздзел
– матэрыялы для правядзення семінарскіх, практычных і інш. заняткаў С. 28–31

4. Раздзел кантроля ведаў:
– пералік пытанняў для заліку С. 32–33

# 1. УВОДЗІНЫ

Праграма курса па выбару “Гендэрная гісторыя ў кантэксце сусветных цывілізацый” уваходзіць у цыкл агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, прызначаных для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі. Прадстаўлены курс па выбару забяспечвае набыццё агульнаадукацыйных ведаў, неабходных як для сацыяльных, так і для прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў сацыякультурнай сферы.

*Асноўныя мэты вывучэння курса:* фарміраванне ў студэнтаў сучаснага светапогляду, свядомай арыентацыі ў грамадстве з пункту гледжання існуючых гендэрных адносінаў, разумення сацыяльнага зместу мужчынскага і жаночага ў гісторыі і сучаснасці, ведання развіцця сістэм маральнасці і гендэрных іерархій, прычын змянення інстытута шлюба і сям’і, традыцый сямейнага жыцця і выхавання дзяцей. Курс таксама мае на мэце паказаць студэнтам складанасць сучаснай сістэмы каштоўнасцей ў сферы гендэрных адносін і інстытута сям’і, а таксама дэмаграфічных, эканамічных, маральных і іншых праблем сучаснасці, звязаных з гендэрнымі трансфармацыямі.

*Задачы вывучэння дысцыпліны:*

- *прадставіць* студэнтам сістэмныя веды, якія раскрываюць ролю жаночага і мужчынскага ў кантэксце цывілізацыйнага развіцця;

- стварыць комплексную карціну гендэрнай трансфармацыі грамадства ў гістарычным, філасофскім і культуралагічным аспектах;

- раскрыць прычыны, наступствы і магчымыя шляхі вырашэння праблем, звязаных са змяненнем гендэрнага статуса чалавека ў сучасным грамадстве, трансфармацыяй інстытута сям’і і пагрозай страты ідэнтычнасці чалавека.

*Метадалагічнай асновай* выкладання з’яўляецца спалучэнне антрапалогічнага (антрапацэнтрычнага) і цывілізацыйнага (культуралагічнага) падыходаў. Курс выкладаецца таксама ў адпаведнасці з сістэмным падыходам, у сувязі з якім гендэрныя характарыстыкі соцыума разглядаюцца ў кантэксце эканамічнага, палітычнага і сацыякультурнага

развіцця канкрэтнага грамадства. Культуралагічны падыход патрабуе таксама разглядаць гендэрныя статусы як феномен культуры з іх аксіялагічнай і семіятычнай складаючай. У адпаведнасці з прынцыпам гістарызма і гісторыка-генетычным метадам матэрыял выкладаецца ў храналагічнай паслядоўнасці.

Выкладанне і засваенне курса прадугледжвае вырашэнне наступных *задач:*

- стварэнне цэласнай сацыякультурнай панарамы ролі жанчыны і мужчыны ў гісторыі;
- выяўленне гендэрных аспектаў маралі, права, культуры, нораваў;
- фарміраванне павагі і разумення значнасці як мужчынскага, так і жаночага ў грамадстве;
- суаднясенне гендэрных аспектаў айчыннай і усеагульнай гісторыі.

У выніку вывучэння курса студэнт *павінен ведаць:*

- асноўныя тэндэнцыі і працэсы гендэрнага развіцця грамадства;
- асаблівасці ў дадзенным кантэксце заходняй і ўсходняй цывілізацыйнай мадэлі;
- уплыў эканамічных, сацыяльных і культурных інстытутаў на гендэрны стан грамадства;
- сучасныя працэсы дэмаграфіі, развіцці шлюба і сям'і, роляў мужчыны і жанчыны, а таксама праблемы, звязаныя з крізісам і пошукам новых мадэляў у названых сферах.

Студэнт павінен *умець:*

- аналізаваць вывучаемыя працэсы і падзеі, параўноўваць і інтэрпрэтаваць розныя пункты гледжання, выпрацоўваць і аргументаваць уласныя меркаванні;
- прымяняць веды па сумежных дысцыплінах (культуралогіі, айчынай і сусветнай гісторыі, гісторыі літаратуры і мастацтваў, гісторыі матэрыяльнай культуры і г.д.).

Студэнт павінен *валодаць*:

- культурай аргументацыі і дыскусіі;
- сістэмным бачаннем сучасных працэсаў у галіне адносін палоў, сям'і і шлюбу, дэмаграфічнага стану грамадства і інш;

Вывучэнне курса па выбару "Генлэрная гісторыя ў кантэксце сусветных цывілізацый" фарміруе наступныя кампетэнцыі будучага спецыяліста:

– ВК – 4 – Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;
– ВК – 7 – Валодаць гуманістычным светапоглядам, якасцямі грамадскасці і патрыятызма;
– БПК – 2 – Інтэрпрэтаваць гісторыю сусветных цывілізацый, вызначаць асаблівасці этнічных супольнасцей, культур і іх эвалюцыю, агульную сацыякультурную сітуацыю.

У адпаведнасці з вучэбным планам для завочнага аддзяленя, курс уключае 10 гадзін, з іх 6 лекцыі, 4 – семінары. Форма правядзення заняткаў – лекцыі і семінары, форма кантролю – залік.

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|
| | лекц. | практ/сем |
| 1.Уводзіны. Асноўныя паняцці курса. Гендэрная іерархія ў традыцыйных грамадствах | 2 | |
| 2. Гендэрная рэгуляцыя ў грамадствах эпохі мадэрна | 2 | |
| 3. Сям'я і шлюб, выхаванне дзяцей і адносіны палоў на беларускіх землях ад старажытнасці да пачатку ХХ ст. | | 2 |
| 4. Гендэрнае становішча і інстытут сям'і ў сітуацыі постмадэрна і глабальных праблем грамадства (другая палова ХХ – пачатак ХХІ ст.) | 2 | |
| 5. Маральнасць і норавы, змяненне гендэрных статусаў, дэфармацыя інстытута сям'і ў кантэксце глабальных праблем сучаснасці | | 2 |
| Усяго 10 гадзін | 6 | 4 |

**2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ**
**ВУЧЭБНЫЯ ВЫДАННІ**

*Асноўныя:*


1. *Бендас, Т. В.* Гендерная психология : учебное пособие / Т. В. Бендас. – СПб. : Питер, 2018. – 432 с.
2. *Введение* в гендерные исследования. Ч.1. Учебное пособие / Под ред. И. Жеребкиной. – СПб : Алетейя, 2001. – 708 с.
3. *Репина, Л.П.* Женщина и мужчина в истории: новая картина европейского прошлого: Очерки: Хрестоматия: Учебное пособие по спецкурсу для студ., обуч. по спец. 02.07.00 – история / Л.П. Репина. – ИН-т всеобщ. ист.РАН; Гос. ун-т гум. наук. – М.: Росспэн, 2002. – 349 с.


*Дадатковыя:*


*1. Беляева, Е.В.* Метаморфозы нравственности: динамика исторических систем нравственности /Е. В. Беляева. – Минск: Экономпресс, 2007. – 464 с.

*2. Гужалоўскі, А.А.* “Сэксуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі: 1917 – 1929 гг. / Аляксандр Гужалоўскі. – Мінск : А.М. Янушкевіч, 2017. – 258 с.

*3. Женщины* в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И.Р. Чикаловой. – Минск : БГПУ, Вып.1. – 2001. – 320 с.

*4. Женщины* в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И.Р. Чикаловой. – Минск : БГПУ, Вып.2. – 2002. – 320 с.

*5. Женщины* в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И.Р. Чикаловой. – Минск : БГПУ, Вып.3. – 2004. – 308 с.

*6. Мальдзіс, А.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя / Адам Мальдзіс. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1982. – 256 с.

*7. Мальдзіс, А.* Як жылі нашы продкі ў XVIII ст. / Адам Мальдзіс. – Мн.: Лімарыус, 2001. – 384 с.

*8. Сліж, Н.* У. Культура сексуальных стасункаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII ст. / Н. У. Сліж. – Мінск: Тэхналогія, 2019. – 229 с.

9. *Сліж, Н.* У. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVII ст. / Н. У. Сліж. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 671 с.
10. *Сям'я* і сямейны быт беларусаў / Бандарчык В.К., Курыловіч Г.М. і інш. Мн.: Навука і тэхніка, 1990 – 253 с.
11. *Филатова, Е. Н.* Белорусско-литовские земли в 1772–1860 гг.: человек и общество / Е. Н. Филатова. – 2-е изд. – Минск : Беларуская навука, 2022. – 335 с.
12. *Шыдлоўскі, С. А.* Памеснае дваранства Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.: Этналагічнае даследаванне / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск: Беларуская навука, 2022. – 221 с.

## ПЛАН-КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ КУРСА ПА ВЫБАРУ “ГЕНДЭРНАЯ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ”

### Тэма 1. 1.Уводзіны. Асноўныя паняцці курса. Гендэрная іерархія ў традыцыйных грамадствах

Гендэрная гісторыя як накірунак гістарычных даследаванняў. З’яўленне і сутнасць паняцця “гендэр”. Гендэр і пол. Гендэрная, сацыяльная і маральная рэгуляцыя. Мараль, маральнасць, норавы. Этас, этыка і этыкет як прыклад гендэрнай рэгуляцыі. Права звычаевае і права пісьмовае як адлюстраванне гендэрных адносінаў грамадства. Сацыяльная канструкцыя пола як сутнасная характарыстыка гендэра. Накірункі гендэрных даследаванняў. Гендэрная гісторыя і жаночая гісторыя. Гендэрныя даследаванні і феміністкі рух. Спектр гендэрнай праблематыкі. Міждысцыплінарнасць гендэрнай гісторыі. Крыніцы для даследаванняў па гендэрнай гісторыі.

Гендэрная сімволіка. Гендэрныя характарыстыкі: мадэль, статус, роля, дыскрымінацыя, дыскурс. Патрыярхальная і мадэрная рэгуляцыя гендэрных адносін. Гендэр і пол у грамадстве постмадэрна і глабалізацыі.

Антрапагенэз і антрапасацыягенэз. Канцэпцыі паходжання чалавека. Першасныя формы арганізацыі чалавечага грамадства ў перыяд каменнага веку. Біялагічныя асаблівасці чалавека ў сферы прыстасавання да навакольнага асяроддзя, нараджэння і выхавання патомства, сэксуальных паводзінаў. Біялагічны і сацыяльны змест ролей мужчыны і жанчыны. Першыя нормы жыцця чалавечага супольніцтва. Прадпісанні і табу. Сутнасць і прычыны матрыярхата. Арганізацыя сям’і. Экзагамія і эндагамія. Адлюстравання ролі жанчыны ў мастацтве каменнага века.

Развіцце гендэрнай іерархіі грамадства ў век металаў. Пераход да вытворчай гаспадаркі, “ваеннай дэмакратыі”, фарміраванне племянной кіруючай эліты. Павышэнне сацыяльнай ролі мужчыны. Паступовая замена матрыярхата патрыярхатам. Сутнасць патрыярхальнай арганізацыі грамадства. Характарыстыка маёмаснага і прававога стану мужчын і жанчын

пры патрыярхаце. Абмежаванні і прадпісанні для жанчын у рамках патрыярхальнага грамадства. Кантроль за сэксуальнымі паводзінамі жанчыны. Умовы, якасць і працягласць жыцця жанчын і мужчын.

Маральныя прыярытэты і архетыпы традыцыйнага грамадства. Звычаевае права, этас, архетыпічныя ўяўленні. Дыферэнцыяцыя гендэрных роляў, прафесійнах заняткаў і ўзроставых катэгорый у рамках традыцыйных уяўленяў. Табу і прадпісанні традыцыйнага грамадства.

Гендэрная рэгуляцыя і інстытут сям'і ў традыцыйных грамадствах Старажытнага Усхода: агульныя рысы і тэндэнцыі.

Становішча мужчыны і жанчыны ў шумерскім грамадстве. Маральныя ўяўленні шумераў і іх адлюстраванне ў міфалагічных творах. Шлюб і сям'я ў Старажытным Вавілоне. Становішча жанчыны паводле законаў Хамурапі. Шлюб, маёмасныя правы жанчыны і дзяцей, усынаўленне, складанне шлюбных пагадненняў. Рэгуляванне паводзінаў мужчын і жанчын у шлюбе. Прастытуцыя храмавая і звычайная. Пакаранні за парушэнне паводзінаў у сэксуальнай сферы.

Асірыйская мадэль гендэрных адносін як прыклад найбольш жорсткай рэгуляцыі паводзінаў жанчын. Шлюб і сям'я як сфера неабвяргальнага панавання мужчыны. Маемасныя правы жанчын і дзяцей. Маральная нормы асірыйскага грамадства. Прадпісанні і пакаранні для жанчын. Вольная жанчына і ўдава ў Асірыі.

Гендэрная іерархія ў Старажытным Егіпце. Жаночае і мужчынскае ў егіпецкай міфалогіі. Жанчыны ў розных сферах старажытнаегіпецкага грамадства. Жанчыны-фараоны. "Дом цара" і "дом царыцы". Магчымасці для жанчын у прафесійнай сферы. Дзеці і іх выхаванне. Адлюстраванне адносін палоў ў егіпецкай літаратуры і мастацтве.

Асаблівасці гендэрнай рэгуляцыі Старажытнай Палесціны. Адносіны палоў, шлюб і сям'я паводле біблейскіх прадпісанняў. Роля жанчыны ў грамадстве паводле звестак Ветхага Запавету. "Песня песняў". Легендарныя жанчыны біблейскай гісторыі. Месца сям'і ў грамадстве, ўмовы і працэдура

заключэння шлюбу. Шлюбныя прадпісанні і забароны. Ідэал жаночай прыгажосці і маральнасці паводле біблейскіх узораў.

Кітайскае грамадства як патрыярхальнае і іерархічнае. Рангі і сацыяльная мабільнасць. Канфуцыянскія нормы як аснова для традыцыйнай маральнасці. Нормы канфуцыянскай этыкі для розных узроставых і палавых катэгорый насельніцтва. Мужчына і жанчына з пункту гледжання даосскай філасофіі. Даосская медыцына і рэкамендацыі па вядзенню сэксуальнага жыцця.

Адносіны палоў, шлюб і сэксуальнае жыццё ў традыцйныі кітайскім грамадстве. Структура патрыярхальнай сям’і. Палігамныя адносіны і іерархія жанчын у палігамнай сям’і. . Адлюстраванне сямейна-шлюбных адносінаў і сэксуальнага жыцця ў творах літаратуры і мастацтва. Змяненні традыцыйнага ладу жіцця пад уплывам мадэрнізацыйных працэсаў XX ст.

Спецыфіка патрыярхальнага японскага грамадства. Маральны узор грамадства. Сінтаісцкая рэлігія, канфуцыянскія і будысцкія нормы. Маральныя прадпісанні і ўяўленні аб абавязку для розных ўзроставых, прафесійных і палавых катэгорый насельніцтва.

Самурайская этыка. Шлюб і сям’я у самураеў. Жанчына ў самурайскім асяроддзі. Жанчыны-пісьменніцы і паэтэсы ў прыдворным асяроддзі. Этыкет і цэрэманіял.

Арганізацыя шлюба, вяселля і сямейнага жыцця ў традыцыйнам японскім грамадстве. Выхаванне дзяцей. Становішча старэйшых і малодшых. Роля і абавязкі жанчыны.

Гейша як спецыфічная з’ява японскага грамадства. Адрозненне становішча гейшы ад стану і заняткаў прастытуткі. Крыніцы, выхаванне і арганізацыя жыцця гейшы. Рангі ў асяроддзі гейш. Прафесійныя патрабаванні да гейшы. Адлюстраванне адносінаў палоў у японскай класічнай літаратуры. Мужчына і жанчына ў японскім мастацтве.

Змяненні ў гендэрных статусах японскага грамадства паводле мерапрыемстваў “рэвалюцыі Мэйдзі”. Еўрапеізацыя краіны і ступень яе

ўплыву на стан жанчыны. Мадэрнізацыйныя працэсы XX ст і змяненне становішча жанчыны. Ідэя жаночай свабоды і яе адлюстраванне ў японскай літаратуры пачатку XX ст. Фармальнае і рэальнае становішча жанчыны ў галіне забеспячэння роўнасці правоў жанчыны ў XX ст. Сучасныя праблемы гендэрных статусаў, інстытута сям'і і адносін пакаленняў у японскім грамадстве.

Патрыярхальнасць індыйскага грамадства і яго арганізацыя паводле "Законаў Ману". Прыход арыяў, з'яўленне варн і каст. Віды шлюбаў у Старажытнай Індыі. Спецыфіка арганізацыі шлюбаў у традыцыйным індыйскім грамадстве. Дамовы аб шлюбах дзяцей і немаўлят.

Арганізацыя вяселля ў Індыі. Становішча жанчыны і яе маёмасныя інтарэсы. Выхаванне дзяцей. Стан удавы. Абрад сацi.

Рэгуляванне сэксуальных паводзінаў і яго адлюстраванне ў рэлігійных прадпісаннях. Кама Сутра. Служыцельніцы храмаў, танцаўшчыцы, прастытуткі і іх становішча ў грамадстве. Адносіны мужчыны і жанчыны ў творах індыйскай літаратуры і мастацтва.

Трансфармацыя гендэрнага становішча жанчыны ў кантэксце мадэрнізацыйных працэсаў XX ст.

Спецыфіка фарміравання мусульманскага грамадства і яго арганізацыі. Дзяржаваствараючая і нораваствараючая роля ісламa. Патрыярхальнасць мусульманскага грамадства. Роля жанчыны паводле Карану і шарыяту. Манагамныя і палігамныя адносіны. Патрабаванні да мусульманскага шлюбу, абавязкі мужчыны і жанчыны. Рэгуляцыя палігамнага шлюбу. Абмежаванні і рэгуляванне паводзін жанчыны да шлюба і ў сям'і. Забяспячэнне маёмаснага стану жанчыны. Выхаванне дзяцей і іх абвязкі.

Мадэрнізацыйная і фундаменталісцкая плыні ў ісламе. Змяненні ладу жыцця і становішча жанчыны ў мусульманскіх краінах паводле мадэрнізацыі XX ст. Ступень змянення маральных узораў і паўсядзеннага жыцця ў розных мусульманскіх краінах.

Мужчына і жанчына ў старажытнагрэчаскім грамадстве. Маральны ідэал антычных грэкаў. Афінская і спартанская мадэлі выхавання, кіравання, ладу жыцця, адносін палоў. Гомасэксуальныя адносіны і гетэрызм. Славутыя гетэры і іх уплыў. Старажытнагрэчаскі шлюб, выхаванне дзяцей, правы супругаў. Змяненні ладу жыцця ў эпоху элінізма.

Маральны узор старажытнарымскага грамадства і яго змяненні ў перыяд імперыі. Рымская матрона як сацыяльны тып. Грамадзянскі ідэал рымляніна часоў рэспублікі і імперыі. Рымскі шлюб і яго формы. Крызіс рымскага грамадства пачатку новай эры і спробы ўлады ўпарадкаваць адносіны палоў. Крызіс грамадства ў канцы Рымскай імперыі. Стан нораваў і сям'і. Прастытуцыя ў старажытнарымскім грамадстве. Стаўленне да сэксуальных дэвіяцый. Маральны ідэал першых хрысціян. Уплыў хрысціянскай царквы на норавы грамадства.

Адлюстраванне мужчынскага і жаночага, адносінаў палоў і стану нораваў у творах антычнай літаратуры і мастацтва.

Карціна свету і месца ў ім чалавека сярэднявечча. Маральныя устоі грамадства. Свет сакральны і свет прафанны, град нябесны і град зямны. Рэгулятыўная роля хрысціянскай царквы ў грамадстве: нарматыў і рэчаіснасць. Выхаванне дзяцей і сістэма адукацыі.

Роля жанчыны ў еўрапейскім сярэднявечным грамадстве. Сацыяльныя магчымасці жанчын розных саслоўяў. Жанчыны-каралевы і жанчыны-фаварыткі. Жанчына ў рэлігійным і мастацкім дыскурсе сярэднявечча.

Маральныя ідэалы розных катэгорый насельніцтва і саслоўяў сярэднявечнага грамадства. Рыцарскі этас. Культ Прыгожай Дамы. Мараль, норавы, шлюб і сям'я гарадскога асяроддзя і сялянскай грамады.

Адносіны да жыцця і смерці, душы і цела ў сярэднявечным грамадстве. Дэмаграфічны стан грамадства і ўмовы жыцця. Стаўленне чалавека да ўласнай цялеснасці ў розныя перыяды сярэднявечча. Жанчына з пункту гледжання царкоўнай маралі. Мараль, норавы, этыкет. Асаблівасці арганізацыі асабістай, бытавой і сямейнай прасторы ў сярэднявеччы.

Адлюстраванне гендэрнай іерархіі, маральных ідэалаў і эстэтычных узораў у творах літаратуры і мастацтва перыяду сярэднявечча. Карнавальная культура і яе сутнасць.

Традыцыйнае усходнеславянскае грамадства і яго гендэрныя характарыстыкі. Мужчына і жанчына ва ўсходнеславянскім грамадстве ў дахрысціянскія часы. Заключэнне шлюба, становішча жанчыны. Манагамія і палігамія. Змяненні ў маральнай рэгуляцыі грамадства, звязаныя з прыняццем хрысціянства.

Мужчына і жанчына ў патрыярхальным грамадстве часоў Кіеўскай Русі і феадальнай раздробленасці. Роля жанчын у кіраванні. Сялянская абшчына і яе маральныя нормы. Праваслаўная царква аб сям'і і ролі жанчыны. "Дамастрой" як звод гаспадарчых, маральных і гендэрных прадпісанняў.

**Тэма 2. Гендэрная рэгуляцыя ў грамадствах эпохі мадэрна Тэма 9. Гендэрныя характарыстыкі еўрапейскага грамадства эпохі Адраджэння**

Маральны, інтэлектуальны і цялесны ідэал перыяду Рэнесанса. Патрыярхальнасць ладу жыцця еўрапейскага грамадства, прамые і ўскосныя магчымасці жанчыны ў грамадстве. Адносіны да жанчыны з боку царквы і грамадства. Прадпісанні і забароны ў паводзінах жанчыны. Жанчына і жаночае цела ў творах літаратуры, мастацтва, царкоўнай этыцы, медыцынскіх працах таго часу. Магчымасці жанчын у галіне адукацыі і прафесійных заняткаў. Куртызанкі і прастытуткі ў эпоху Адраджэння. Роля дзяржавы і царквы ў кантролю над прастытуцыяй.

Шлюб, сям'я, выхаванне дзяцей, маёмасныя правы жанчыны. асаблівасці маральнай рэгуляцыі розных катэгорый грамадства. Жанчыны розных саслоўяў і асаблівасці стаўлення да іх. Куртуазнасць і галантнасць. Маральны ўзор куртуазных кавалера і дамы. Маральнае разнявольванне чалавека ў творах літаратуры і мастацтва эпохі Адраджэння. Змяненне маральных прыярытэтаў у сувязі з распаўсюджваннем пратэстанцкай этыкі.

Становішча жанчыны паводле статутаў Вялікага Княства Літоўскага. Шлюбны ўзрост, маёмасныя правы супругаў, выхаванне дзяцей, апека, развод у Вялікім Княстве Літоўскім. Маральны ўзор для мужчыны і жанчыны шляхецкага саслоўя. Шлюбныя і пазашлюбныя адносіны ў шляхецкім асяроддзі. Магчымасці атрымання і працэдура развода.

Умовы жыцця, дэмаграфічны стан грамадства і паўсядзеннасць у ранні Новы час. Месца жанчыны ў саслоўным грамадстве XVII і XVIII ст. Магчымасці адукацыі і набыцця ўласнай справы для жанчын розных сацыяльных груп. Прамое і ўскоснае ўздзеянне жанчын на палітычныя і культурная працэсы. Фаварытызм. Маральныя прыярытэты грамадства “Старога парадку”. Арыстакратычная і буржуазная мадэлі арганізацыі шлюбу і прыватнага жыцця. З’яўленне і афармленне прыватнай прасторы і арыстакратычнага салона. Галантнасць і прыдворная культура. Уплыў арыстакратаычных салонаў на палітычнае і культурнае жыццё. Маралістычныя працы і прадпісанні этыкета. Змяненне інтэлектуальнага і культурнага жыцця ў эпоху Асветы. Магчымасці жаночай адукацыі і прафесійнай дзейнасці. Жанчыны-палітыкі.

“Галантнае стагоддзе”: мараль, нормы, узор прыгажосці, мода, сэксуальнасць. Фаварытызм. Жанчыны-імператрыцы і каралевы. Узоры паводзін у шлюбе і па-за ім у арыстакратычным і буржуазным асяроддзі. Выхаванне дзяцей згодна з арыстакратычным і буржуазным узорам. Пурытанскія маральныя нормы і выхаванне. Удзел жанчын у Французскай рэвалюцыі. Адлюстраванне маралі і нораваў, гендэрных статусаў і праблем жаночай свабоды ў літаратурных творах эпохі Асветы.

“Галантнае стагоддзе” у жыцці Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Мараль і норавы розных катэгорый насельніцтва. Стан і магчымасці жанчыны. Адносіны да жанчыны ў сістэме шляхецкіх маральных прадпісаняў. Жыццёвы шлях і дзейнасць Г. Радзівіл, Ф. Радзівіл, С. Русецкай і інш. як паказчык пашырэння сацыяльных рамак паводзінаў жанчын.

Новыя з’явы эканомікі і сацыякультурнага развіцця ў XIX ст. Прамысловая вытворчасць, патрэба ў жаночай працы, урбанізацыя. Развіццё медыцыны і медыцынскай дапамогі, павялічэнне працягласці жыцця. Дэмаграфічны стан грамадства. Змяненне ўзросту ўступлення ў шлюб і колькасці дзяцей, рэгуляванне нараджальнасці.

Уплыў асветніцкай і сацыял-дэмакратычнай ідэалогіі. З’яўленне феміністкай ідэі. Жаночае пытанне ў грамадскай свядомасці ЗША і Еўропы ў другой палове XIX ст. Жанчыны-пісьменніцы, ідэолагі роўных магчымасцей і правоў для жанчыны ў сферы прыватнага жыцця (Дж. Осцін, Ш. Брантэ, Ж. Санд, Э. Ажэшка і інш). Ідэя жаночай працы і адукацыі ў Еўропе і Расійскай імперыі (С. Кавалеўская). Пераход жаночай праблематыкі ў сферу палітычных правоў. Жанчыны-ўдзельніцы рэвалюцыйнага руху ў Еўропе і Расійскай імперыі (К. Брашка-Брашкоўская і г.д.). Суфражызм.

Маёмасныя правы жанчыны і іх рэгуляванне. Становішча жанчыны ў сямейна-бытавой сферы. Патрыярхальная сямейная мадэль у розных сацыяльных слаях. Сялянская і мяшчанская сям’я. Вольнае каханне. Жанчына на ўтрыманні і жанчына-прастытутка. Праблема набыцця маёмаснай незалежнасці жанчынай і “сумленная праца”. Прастытуцыя як сацыяльная справа і рэгуляванне яе дзяржавай.

Маральныя прадпісанні буржуазнага грамадства. Паняцце аб прыстойным і непрыстойным. Віктарыянская мараль і паводзіны. Цялесны ідэал. Дазволеныя і недазволеныя праявы сэксуальнасці. Адлюстраванне маралі і нораваў эпохі ў літаратуры і мастацтве XIX ст.

Развіццё індустрыяльнага грамадства на мяжы XIX – XX ст. Урбанізацыя, масавая вытворчасць, патрэба ў жаночай працы. Ідэі здаровага ладу жыцця і распаўсюджванне спорту. Рэгуляванне нараджальнасці і сродкі кантрацэпцыі. Жаночыя прафесіі і магчымасці жанчын у атрыманні адукацыі. Першая хваля фемінізма і яе ідэйны змест. Жанчыны ў палітычнай дзейнасці і рэвалюцыйным руху. З’яўленне свята 8 Сакавіка.

Кастрычніцкая рэвалюцыя і змяненне правоў жанчын. Карэнная змена сямейна-шлюбнай сферы Савецкай Расіі і Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Адмаўленне традыцыйнай гендэрнай мадэлі. Рэвалюцыйны ідэал кахання і адносінаў палоў і яго ідэолагі (А. Калантай, Л. Рэйснер і інш.). Новыя формы шлюбу і арганізацыя камун. Дэмаграфічны стан грамадства і рэгуляванне нараджальнасці. Заканадаўства першых гадоў савецкай ўлады ў сямейна-шлюбнай сферы. Фарміраванне сацыяльнага тыпу “савецкая жанчына” і яго рысы. Маральныя, сацыяльныя і дэмаграфічныя наступствы эксперыментаў 1920-х гг. Прастытуцыя ў першае паслярэвалюцыйнае дзесяцігоддзе і барацьба з ёй савецкай улады.

Паварот у сямейна-шлюбным заканадаўстве з 1930-х гг. Новыя маральныя ўстаноўкі савецкага грамадства. Згортванне “сэксуальнай рэвалюцыі” і пераход да савецкай мадэлі шлюбу і сям’і. Маральны ідэал і прадпісанні ў сэксуальнай сферы.

Змяненні ў сацыяльным і прафесійным становішчы жанчыны. Жанчыны ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы і грамадскіх арганізацыях, сферы кіравання. Удзельная вага жанчын у атрыманні вышэйшай адукацыі. Жанчыны ў часы Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны. Жанчына на фронце, у тыле, у перыяд акупацыі і ў партызанскім руху. Жанчыны-гераіні Савецкага Саюза. Праблемы гендэрнага становішча савецкага грамадства пасля Вялікай Айчыннай вайны. Дыспрапорцыі ва ўзроставай і палавой структуры грамадства. Гендэрная палітыка ў СССР. Савецкая жанчына як сацыяльны феномен. Наступствы эмансіпацыі, урбанізацыі, павышэння адукацыйнага ўзроўню жанчын. Маральныя ўзоры адносін палоў і палавое выхаванне ў савецкім грамадстве. Жанчына і мужчына ў літаратуры і мастацтве СССР.

**Тэма 4. Маральнасць і норавы, змяненне гендэрных статусаў, дэфармацыя інстытута сям’і ў кантэксце глабальных праблем сучаснасці**

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя, яе сацыяльныя і ідэйныя наступствы. Стан адукацыі і грамадскай думкі. Усеагульная Дэкларацыя правоў чалавека і дэкларацыя правоў жанчыны. Канстытуцыйнае замацаванне правоў жанчыны. Прафесійная рэалізацыя жанчын у заходнім грамадстве. Другая хваля фемінізма і яе змест. Сэксуальная рэвалюцыя 1960-х-1970-х гг. на Захадзе. З'яўленне "новых левых" і маладзежнай нефармальнай культуры. Заканадаўства краін Заходняй Еўропы ў галіне лібералізацыі сямейна-шлюбных адносінаў, абортаў, стану сэксуальных меньшасцей. Правы жанчына і правы дзіцяці і іх афармленне. Наяўнасць розных мадэляў паводзінаў і маральных узораў.

Гендэрны і дэмаграфічны стан савецкага грамадства апошніх дзесяцігоддзяў існавання СССР. Эпоха "перабудовы" і "сэксуальная рэвалюцыя" ў СССР. Трансфармацыя маральных установак і гендэрных стэрэатыпаў у паводзінах мужчын і жанчын. Адлюстраванне працэсаў гендэрных і маральных змен у літаратуры, мастацтве і грамадскай думцы.

Паглыбленне працэсаў эмансіпацыі і трэцяя хваля фемінізма. Становішча гендэрнай альтэрнатыўнасці ў сучасным грамадстве. Праблема гендэрнай і сэксуальнай ідэнтычнасці і адносіны да яе ў розных сферах і сацыяльных групах сучаснага грамадства. Існаванне розных мадэлей канструіравання сямейна-шлюбных адносінаў. Сям'я і выхаванне дзяцей ў кантэксце правоў дзіцяці і ювенальнай юстыцыі. Шматдзетнасць і рух чайлд-фры. Бяздзетныя і асэксуальныя сем'і. Праблема адзіноты і розныя варыянты ўладкавання прыватнага жыцця ва ўмовах інфармацыйнага грамадства і віртуальнай рэальнасці.

Адраджэнне і актывізацыя традыцыйнай гендэрнай мадэлі сэксуальна-шлюбных адносінаў. Шлюбны ўзрост, патрабаванні да партнера, праблемы маладых сямей і іх вырашэнне. Формы сучаснага шлюба. Фактары і прычыны разводаў. Шлюбна-сямейнае заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Праблемы сучаснага гендэрнага становішча Беларусі. Мужчыны і жанчыны Беларусі ва ўзроставых, адукацыйных, працоўных, кіруючых і іншых сферах.

Глабалізацыя, інфарматызацыя і сацыяльная мабільнасць як фактары гендэрнага стану сучаснага грамадства. Заходняя і усходняя цывілізацыйная мадэлі. Ступень уплыву новых з’яў ў сямейна-шлюбнай сферы і адносінах палоў ў розных краінах Усходу.

Глабальныя праблемы сучаснасці і прагнозы развіцця чалавека ў кантэксце дэмаграфыіі і развіцця інстітута сям’і, прыватнага жыцця і сэксуальнай сферы.

## 3.ІНШЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ (НАВУКОВАЯ ЛІТАРАТУРА)

1. *Адам* и Ева: Альманах гендерной истории / гл. ред. Репина Л.П. – М : ИВИ РАН, – [2001…]

2. *Алексеев, В.П.,* Першиц, А.И. История первобытного общества: Учеб. для студентов вузов по спец. «История» / В.П. Алексеев, А.И. Першиц. – 6-е изд. – М.: ООО «Издательство АСТ»: ООО «Издательство Астрель», 2004. – С.125-131, 134-139, 175-192, 216-233, 217-246, 284-298, 328-332.

3. *Аникович, М.* Повседневная жизнь охотников на мамонтов / Михаил Аникович. – М.: Молодая гвардия. – 2004. – С.154-295.

4. *Арьес, Ф.* Ребенок и семейная жизнь при Старом порядке / Филипп Арьес / пер. с фр. Я.Д. Старцева. – Екатеринбург, Изд-во Урал. ун-та, 1999. – 416 с.

5. *Бартон, Э.* Повседневная жизнь англичан в эпоху Шекспира / Элизабет Бартон. – Пер. с англ. С.С. Смольняковой. – М.: Молодая гвардия, 2005. – 243 с.

6. *Беляева, Е.В.* Метаморфозы нравственности: динамика исторических систем нравственности /Елена Беляева. – Минск: Экономпресс, 2007. – 464 с.

7. *Белова, А.В.* «Четыре возраста женщины». Повседневная жизнь русской провинциальной дворянки XVIII – середины XIX вв./ А.В. Белова. – СПб.: Алетейя, 2010. – 480 с.

8. *Быт* и нравы русского народа в XVI и XVII столетиях [Сборник] – Смоленск: Русич, 2003. – 559 с.

9. *Бэрк, П.* Народная культура Эўропы ранняга Новага часу / Пітэр Бэрк. – Пер. з англ. І. Ганецкай; Пад рэд. А. Ліса. – Мн.: Тэхналогія, 1999. – С.178-233.

10. *Бобровникова, Т.А.* Повседневная жизнь римского патриция в эпоху разрушения Карфагена / Татьяна Бобровникова. – М.: Мол. гвардия, 2001. – С.135-306, 331-444.

11. *Богословский, М.М.* Быт и нравы русского дворянства в первой половине XVIII века / М. Богословский. – Изд. 2-е, Пг.: “Задруга”, 1918. – 47 с.

12. *Борисов, Н.С.* Повседневная жизнь средневековой Руси накануне конца света: Россия в 1492 году от рождества Христова, или в 7000 году от Сотворения мира / Н.С. Борисов. – М.: Молодая гвардия, 2004. – С. 476-513.

13. *Брюле, П.* Повседневная жизнь древнегреческих женщин в классическую эпоху / Пьер Брюле. – Пер. с фр. Т.А. Левиной. – М.: Молодая гвардия, 2005. – 239 с.

14. *Бэшем, А.* Цивилизации Древней Индии / Артур Бэшем; пер. с фр. Е. Гавриловой под ред. Н. Шевченко. – Екатеринбург: У-Фактория, 2007. – С.134-185.

15. *Вагабов, М.В.* Ислам, женщина, семья / М.В. Вагабов. – Махачкала, Даг. кн. Изд-во, 1994.

16. *Васецкий, Н.А.* Женщины российской короны / Н.А. Васецкий. – М.: Междунар. отношения; Фонд «Знание», 1994. – 159 с.

17. *Васильева, Л.* Кремлевские жены / Лариса Васильева. – М. : Вагиус; Мн.: Выш. школа, 1993. – 544 с.

18. *Веллард, Дж.* Вавилон. Расцвет и гибель города Чудес / Дж. Веллард; пер. с англ. О.И. Перфильева. – М.: Центрополиграф, 2003. – 268 с.

19. *Гиро, П.* Быт и нравы древних греков / Поль Гиро. – Смоленск: Русич, 2000. – С. 5-151.

20. *Гиро, П.* Быт и нравы древних римлян / Поль Гиро. – Смоленск: Русич, 2000. – С. 27-52, 193-246.

21. *Гісторыя* Беларусі: У 6 т. Т.1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мн.: “Экаперспектыва”, 2000. – С.269-287.

22. *Гісторыя* Беларусі: У 6 т. Т.3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII-XVIII ст.) / Ю. Бохан, В. Голубеў, У Емельянчык і інш.; Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мн.: Экаперспектыва, 2004. – С.277-302.

23. *Гісторыя* Беларусі: У 6 т. Т.4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII-пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч і інш.; Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мн.: Экаперспектыва, 2005. – С.222-232.

24. *Гісторыя* Беларусі: У 6 т. Т.5.Беларусь у 1917-1945 гг. /А.Вабішчэвіч [і інш.]; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – М.: Экаперспектыва, 2006. – С.121-130, 285-299, 518-533.

25. *Грэй, Дж.* Г. История Древнего Китая / Джон Генри Грэй; пер. с англ. А.В. Вальдман. – М.: Центрополиграф, 2006. – С.151-317.

26. *Гуревич, Д.,* Рапсат-Шарлье, М.-Т. Повседневная жизнь женщины в Древнем Риме / Даниэль Гуревич, Мари-Терез Шапсат-Шарлье. – Пер. с фр. Н.Н. Зубкова. – М.: Молодая гвардия, 2006. – 260 с.

27. *Домашний* быт русских царей в XVI и XVII вв.: По Забелину, Ключевскому, Карновичу и др. / сост. М.Т. Волховский. – М.: Гос. Публ. Ист. Б-ка России, 1997. – 128 с.

28. *Дубинский, Д.* Женщина в жизни великих и знаменитых людей / Д. Дубинский. – Мн.: Беларусь, 1996. – 512 с.

29. *Дэвис, Н.* История Европы / Норман Дэвис; пер. с англ. Т.Б. Менской. – М.: АСТ; Транзиткнига, 2004. – С. 54-55, 77, 89, 91, 124-125, 135, 140, 146, 172, 219-221, 252-253, 301, 312, 327, 372, 375, 377, 398-399, 411, 416, 438, 449, 529, 573-571, 579, 585, 590, 595-596, 635, 638.

30. *Елисеефф, В.* Японская цивилизация /Вадим Елисеефф, Даниель Елисеефф; пер. с франц. И. Эльфонд. – Екатеринбкрг: У-Фактория, 2005. – С.113-129.

31. *Еремеев, Д.Е.* Ислам. Образ жизни и стиль мышления / Д.Е. Еремеев. – М.: 1990. – 286 с.

32. *Женщины* – легенды / Сост., науч. ред. и авт. предисл. В.А. Федосик. – Мн.: Беларусь, 1993. – 336 с.

33. *Жизнь* и нравы старого Китая /Д. Макгован. Китайцы у себя дома; И. Коростовец. Китайцы и их цивилизация. – Смоленск: Русич, 2003. – С.139-146, 309-324.

34. *Забелин, И.Е.* Домашний быт русского народа в XVI и XVII ст. /Иван Забелин [Репр. изд.]. – М.: Язык рус. культ, 2000. – 254 с.

35. *Зайцев, А.В.* Мировая культура: Шумерское царство. Вавилон и Ассирия. Древний Египет. / А.В. Зайцев, В.Я. Лаптева, А.В. Порьяз. – М.: ОЛМА-ПРЕСС, 2000. – С.47-57, 143-153, 179-181, 331-356.

36. *Земерау, А.,* Цайдлер, П. Великие куртизанки: Исторические новеллы / Альфред Земерау, Пауль Цайдлер; пер. с нем. С. Цырульникова. – Н. Новгород: Фокс, 1992. – 238 с.

37. *Золоева, Л.В.* Мировая культура: Древняя Греция. Древний Рим/ А.В. Зайцев, В.Я.Лаптева, А.В. Порьяз. – М.: ОЛМА-ПРЕСС, 2000. – 83-98, 311-338.

38. *Иванов, К.А*. Многоликое средневековье: сб. /К.А. Иванов. – 2-е изд. – М.: Алатейя, 2001. – 452 с.

39. *История* женщин на Западе: в 5 т. Т.2 : Молчание Средних веков / под общ. ред. Ж. Дюби – СПб.: Алетейя, 2009. – 512 с.

40. *История* женщин на Западе: в 5 т. Т.3 : Парадоксы эпохи Возрождения и Просвещения / под общ. ред. Ж. Дюби – СПб.: Алетейя, 2008. – 560 с.

41. *История* Нового времени: 1600-1799 годы: учеб. Пособие для студ. высш. учеб. заведений / [А.В. Чудинов, Д.Ю. Бовыкин, А.С. Медяков и др.]; под ред. А.В. Чудинова, П.Ю. Уварова, Д.Ю. Бовыкина. – М.: Издательский центр «Академия», 2007. – С. 37-52.

42. *Ислам* и женщины Востока. Ташкент: Фан, 1990.

43. *Казиев, Ш.* Повседневная жизнь восточного гарема / Шапи Казиев. – М.: Молодая гвардия, 2006. – 266 с.

44. *Костомаров, Н.И.* Очерк домашней жизни и нравов великорусского народа в XVI и XVII столетиях / авт. Очерк о жизни и ТВ. Н.И. Костомарова и коммент. Б.Г. Литвак. – М.: Республика, 1992. – 301 с.

45. *Клулас, И.* Повседневная жизнь в замках Луары в эпоху Возрождения /Иван Клулас; пер. с фр. О. Жуковой, Л. Кайсаровой; Науч. ред. и вступ.ст. А.П. Левандовского. – 2-е изд. – М.: Молодая гвардия, 2006. – 358 с.

*46. Лабрюйер, Ж.* де. Характеры, или Нравы нынешнего века/Жан де Лабрюйер; пер. с фр. Ю. Корнеева, Э. Линецкой. – М.: ООО «Издательство АСТ»; Харьков: Издательство «Фолио», 2001. – 607 с.

*47. Ле Гофф, Ж.,* Трюон, Н. История тела в средние века. – Жак Ле Гофф, Николя Трюон, пер. с фр. – М.; Текст, 2008. – 189 с.

*48. Майлз, Р.* Жаночая гісторыя свету / Разалінд Майлз. – Мінск: БелФранс, 2006. – 284 с.

*49. Мак-Клейн, Дж.* Л. Япония. От сёгуната Токугавы – в XXI век / Джеймс Л. Маклейн; пер. с англ. Е.А. Красулина. – М.: АСТ: Астрель, 2006. – С. 123-162, 360-397, 847-874.

*50. Малявин, В.В.* Повседневная жизнь Китая в эпоху Мин / Владимир Малявин. – М.: Молодая гвардия, 2008. – 451 с.

*51. Мань, Э*. Повседневная жизнь в эпоху Людовика XIII / Эмиль Мань. – СПБ.: "Евразия", 2002. – 287 с.

*52. Марков, Б.В.* Культура повседневности. Учебное пособие /Б.В. Марков. – СПб.: Питер, 2008. – 352 с.

53. *Масленицына, И.А.* Летописцы повествуют о любви / И.А. Масленицына. - Мн.: Беларусь, 2002. – 240 с.

*54. Масленицына, И.А.* По рыцарским законам / И.А. Масленицына. – Мн.: Полымя, 2001. – 208 с.

*55. Масленицына, И.А.* Кавалеры и дамы белорусского Ренессанса / И.А. Масленицына. – Мн.: Полымя, 2000. – 192 с.

*56. Масленицына, И.А.* Век сентиментальных писем / И.А. Масленицына. – Мн.: Беларусь, 2004. – 255 с.

*57. Митфорд, Н.* Придворная жизнь в эпоху абсолютизма / Н. Митфорд; Сб.; пер. с англ. – Смоленск: Русич, 2003. – 552 с.

*58. Монте, П.* Повседневная жизнь египтян во времена великих фараонов / Пьер Монте; пер с фр. Ф.Л. Мендельсона; науч. ред., предисл. и примеч. О.В. Томашевич. – М.: Мол. гвардия, 2000. – 465 с.

59. *Моррис, Д.* Голая обезьяна / Десмонд Моррис. – Пер. с англ. В. Кузнецова. – СПб. : Амфора, 2001. – 269 с.
60. *Мышуста, С.В.* Древний Египет: Женщины-фараоны / С.В. Мышуста. – Ростов н/Д: Феникс, 2006. – 317 с.
61. *Новейшая* история России. 1914-2002: Учебное пособие / под ред. М.В. Ходякова. – М.: Юрайт-Иэдат, 2004. – С.31-45, 88-91, 136-147, 190-208, 252-261, 302-308, 335-343, 373-381, 417-424.
62. *Порьяз, А.В.* Мировая культура: Средневековье/ А.В. Порьяз. – М.: ОЛМА-ПРЕСС, 2001. – С.147-161, 300-341.
63. *Порьяз, А.В.* Мировая культура: Возрождение. Эпоха Великих географических открытий / А.В. Порьяз. – М.: ОЛМА-ПРЕСС, 2001. – С.279-312.
64. *Прожогина, С.В.* Женский портрет на фоне Востока и Запада / С.В. Прожогина; Ин-т востоковедения. – М.: Вост. лит., 2006. – 478 с.
65. *Пронников, В.А.,* Ладанов, И.Д. Японцы (этнопсихологический очерк) / В.А. Пронников, И.Д. Ладанов. – М.: ВиМ, 1996. – 400 с.
66. *Пушкарева, Н.Л.* Женщина России и Европы на пороге нового времени / Н.Л. Пушкарева. – Рос. акад. наук, ин-т этнологии и антропологии им. Н.Н. Миклухо-Маклая. – М.: 1996. – 285 с.
67. *Райх, В.* Сексуальная революция. /В. Райх. – СПб.,Унив. Кн.; М.: АСТ, 1997.
68. *Робер, Ж.-Н.* Повседневная жизнь Древнего Рима через призму наслаждений /Жан-Ноэль Робер: Пер. с фр. Т.А. Левиной. – М.: Молодая гвардия, 2006. – 245 с.
69. *Романов, Б.А.* Люди и нравы Древней Руси: историко-бытовые очерки XI-XIII вв. /Б.А. Романов. – Л.: Наука, 1966.
70. *Рябова, Т.Б.* Женщина в истории западноевропейского средневековья / Т.Б. Рябова. – Ивановский гос. ун-т. – Иваново: Изд. центр “Юнона”, 1999. – 211 с.
71. *Секс* и эротика в русской традиционной культуре. М.: Научно-издат. центр “Ладомир”, 1996.

72. *Серебрякова, Г.И.* Женщины эпохи Французской революции /Г.И. Серебрякова. – М.: Сов. писатель, 1964. – 278 с.

73. *Сидихменов, В.Я.* Китай: Общество и традиции / В.Я. Сидихменов. – М.: Смоленск: Русич, 1990. – 480 с.

74. *Сидихменов, В.Я.* Китай: Страницы прошлого / В.Я. Сидихменов. – Смоленск: Русич, 2003. – С.335-400.

75. *Сліж, Н.* Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVII стст. / Наталля Сліж. – Смаленск: ТАА “Інбелкульт”, 2015. – 672 с.

76. *Фёдорова, Е.В.* Императорский Рим в лицах / Е.В. Фёдорова. – Изд. 2-е. – Смоленск: Инга, 1995. – 416 с.

77. *Фицджеральд, Ч.П.* История Китая / Чарлз Патрик Фицджеральд: Пер. с англ. Л.А. Калашниковой. – М.: ЗАО Центрополиграф, 2005. – С.104-129.

78. *Флори, Ж.* Повседневная жизнь рыцарей в средние века / Жан Флори. – М.: Молодая гвардия, 2006. – С.284-325.

79. *Фредерик, Л.* Повседневная жизнь Японии в эпоху Мэйдзи /Луи Фредерик. – Пер. с фр. А.Б. Овезовой; Науч. Редакция М.В. Демченко. – М.: Молодая гвардия, 2007. – С. 95-176.

80. *Фукс, Э.* История нравов /Эдуард Фукс: Пер. с нем. В.М. Фриче. – Смоленск: Русич, 2002. – 624 с.

81. *Чикалов, Р.А.,* Чикалова, И.Р. Западная Европа и Соединеные Штаты америки (1815-1918 годы): Учеб. особие  для студентов исторических специальностей высших учебных заведений/Р.А. Чикалов, И.Р. Чикалова. – Мн.: “Тесей”, 2000. – С.410-444.

82. *Чикалова, И.Р.* Партии и власть в США и Великобритании: гендерная политика в 1970-е – 1990-е годы / И.Р. Чикалова. – Минск: Тесей, 2000 – 288 с.

83. *Шураки, А.* Повседневная жизнь людей Библии / Андре Шураки. – Пер. с фр. А.Е. Винник. – М.: Молодая гвардия, 2004. – С. 110-136.

*84. Элиас, Н.* Придворное общество: Исследование по социологии короля и придворной аристократии / Н. Элиас. – М.: Яз. сл. Культуры – Кошелев, 2002. – 366с.
*85. Япония:* Иделогия, культура, литература / Отв. ред. В.И. Горегляд, В.М. Гривнин. – М. Наука, 1989. – 199 с.

## 2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЯ СЕМІНАРАЎ І ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### Семінар 1. Сям'я і шлюб, выхаванне дзяцей і адносіны палоў на беларускіх землях ад старажытнасці да пачатку ХХ ст.

1. Гендэрныя адносіны ва ўсходнеславянскім грамадстве.. Жанчыны ў Полацкім княстве. Рагнеда і Еўфрасіння Полацкая.
2. Традыцыйная сялянская сям'я. Гендэрныя ролі мужчыны і жанчыны ў звычаях, абрадах, народнай творчасці.
3. Становішча жанчыны паводле Статутаў Вялікага Княства Літоўскага. Шлюбны ўзрост, маёмасныя правы сужэнцаў, выхаванне дзяцей, апека, развод у Вялікім Княстве Літоўскім.
4. Маральны ўзор для мужчыны і жанчыны шляхецкага саслоўя. Шлюбныя і пазашлюбныя адносіны ў шляхецкім асяроддзі. Магчымасці атрымання і працэдура развода.
5. Жыццёвы шлях і дзейнасць Г. Радзівіл, Ф. Радзівіл, С. Русецкай і інш. як паказчык пашырэння сацыяльных рамак паводзінаў жанчын.
6. Жанчына і мужчына ў шляхецкім і дваранскім асяроддзі пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі. Жанчыны-ўдзельніцы паўстанняў і грамадскіх рухаў. Дабрачынная дзейнасць жанчын і пачатак жаночага руху.
7. Кастрычніцкая рэвалюцыя і карэнная змена сямейна-шлюбнай сферы. Новыя формы шлюбу і арганізацыя камун. Наступствы гендэрных эксперыментаў 1920-х гг.
8. Жанчыны ў часы Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны. Жанчыны-гераіні Савецкага Саюза. Наступствы Вялікай Айчыннай вайны ў дэмаграфічнай і гендэрнай сферах. Савецкая жанчына як сацыяльны феномен.

**Літаратура:**

*Спіс літаратуры носіць рэкамендацыйны характар, студэнт не абмежаваны ў выбары матэрыялаў для семінарскіх заняткаў, асабліва па пытаннях 7 і 8, прадстаўленых у вялікай колькасці матэрыялаў у друкаваным і электронным выглядзе.*


1. *Гужалоўскі, А.А.* "Сэксуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі: 1917 – 1929 гг. / Аляксандр Гужалоўскі. – Мінск : А.М. Янушкевіч, 2017. – 258 с.
2. *Калачова, І. І.* Мужчынскае і жаночае ў традыцыйнай культуры беларусаў / І. І. Калачова. - Мінск : Беларуская навука, 2019. - 165, [1] с. : іл.
3. *Калачова, І. І.* Сям'я і шлюб беларусаў у гістарычнай рэтраспектыве і перспектыве / І. І. Калачова. - 2-е выд., дап. - Мінск : РІВШ, 2015. - 143 с.
4. *Мальдзіс, А.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя / Адам Мальдзіс. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1982. – 256 с.
5. *Мальдзіс, А.* Як жылі нашы продкі ў XVIII ст. / Адам Мальдзіс. – Мн.: Лімарыус, 2001. – 384 с.
6. *Сліж, Н.* У. Культура сексуальных стасункаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII ст. / Н. У. Сліж. – Мінск: Тэхналогія, 2019. – 229 с.
7. *Сліж, Н.* У. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVII ст. / Н. У. Сліж. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 671 с.
8. *Сям'я* і сямейны быт беларусаў / Бандарчык В.К., Курыловіч Г.М. і інш. Мн.: Навука і тэхніка, 1990 – 253 с.
9. *Филатова, Е. Н.* Белорусско-литовские земли в 1772–1860 гг.: человек и общество / Е. Н. Филатова. – 2-е изд. – Минск : Беларуская навука, 2022. – 335 с.

10. *Шыдлоўскі, С. А.* Паместнае дваранства Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.: Этналагічнае даследаванне / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск: Беларуская навука, 2022. – 221 с.

## Семінар 2. Маральнасць і норавы, змяненне гендэрных статусаў, дэфармацыя інстытута сям'і ў кантэксце глабальных праблем сучаснасці

1. Прычыны змяненняў гендэрных статусаў мудчыны і жанчыны у сучасным грамадстве. Крызіс ідэнтычнасці.
2. Сацыяльная мабільнасць, эмансіпацыя жанчыны, дэфармацыя традыцыйнай сям'і.
3. Альтэрнатыўныя формы арганізацыі сям'і і прыватнага жыцця асобы: плюсы і мінусы. Праблема аднаполых шлюбаў і талерантнасці грамадства.
4. Прыватнае жыццё асобы і інтэрнэт. Сацыяльныя сеткі як сродак камунікацыі, станоўчыя і адмоўныя бакі.
5. Дэмаграфічны крызіс грамадства і яго прычыны. Свядомае нежаденне мець дзяцей, яго прычыны і наступствы.
6. Разнастайнасць сістэм маральнасці ў сучасным грамадстве. Праблема выбару асобы і адказнасць чалавека.
7. Заканадаўства аб шлюбе і сям'і ў Рэспубліцы Беларусь.

***Літаратура:***

*Спіс літаратуры носіць рэкамендацыйны характар, студэнт не абмежаваны ў выбары матэрыялаў для семінарскіх заняткаў.*

1. Копер, С. Жанчыны Другой Рэчы Паспалітай / Славамір Копер ; пер. з польскай [Г. Пальянавай, І. Пальянавай]. - Мінск : Галіяфы, 2017. - 382, [4] с.

2. Социология : учеб. пособие для студентов учреждений высшего образования / под общ. ред. А. Н. Данилова. - Минск : РИВШ, 2023. – С. 141-152.
3. Беляева, Е.В. Метаморфозы нравственности: динамика исторических систем нравственности /Елена Беляева. – Минск: Экономпресс, 2007. – 464 с.
4. Заболотный, В.М. Новейшая история стран Европы и Северной Америки: Конец XX – начало XXI века: Учеб. пособие для студентов/ В.М. Заболотный. – М.: ООО «Издательство АСТ»: ООО «Издательство Астрель», 2004. – С.7–24, 34–43.
5. Кодекс Республіки Беларусь о браке и семье 9 июля 1999 г., № 278-З: Режим доступа: https://etalonline.by/document/?regnum=HK9900278

## 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

**Пытанні для заліку курса па выбару “Гендэрная гісторыя ў кантэксце сусветных цывілізацый”**

1. Гендэрная гісторыя як накірунак гістарычнай навукі, яе сувязь з гістарычнымі і грамадазнаўчымі дысцыплінамі.
2. Гендэр: вызначэнне і сутнасць паняцця. Суадносіны паняццяў “пол”, “гендэр”, “сацыяльная група”.
3. Сям’я і шлюб як адзін з важнейшых бакоў жыццядзейнасці соцыума. Віды і формы сям’і.
5. Гендэрны падзел і гендэрная іерархія ў першабытным грамадстве
8. Маральна-этычныя асновы традыцыйных грамадстваў.
9. Гендэрная іерархія, шлюб і сям’я у краінах Старажытнага Усхода.
10. Светапогляд, маральнасць і норавы ў Старажытнай Грэцыі. Старажытнагрэчаская сям’я.
11. Маральнасць, стандарты паводзін і норавы ў Старажытным Рыме. Старажытнарымская сям’я.

12. Спецыфіка светапогляду і маральнай рэгуляцыі ў сярэднявечнай Еўропе. Уплыў хрысціянства на традыцыйную маральнасць і норавы сярэднявечча.
13. Шлюб і сям'я ў розных сацыяльных групах сярэднявечнага грамадства.. Куртуазнае каханне.
14. Мужчына і жанчына ў мусульманскім грамадстве.. Іслам як лад жыцця. Традыцыяналізм мусульманскага грамадства.
15. Асновы маральнасці традыцыйнага славянскага грамадства. Абшчыннасць і патрыярхальнасць.
16. Адносіны мужчыны і жанчыны, сям'я і шлюб у Вялікім Княстве Літоўскім.
17. Сям'я і шлюб, бацькі і дзеці, апякунства паводле Статутаў ВКЛ.
18. Шлюб і сям'я ў традыцыйным грамадстве на беларускіх землях. Патрыярхальная сям'я.
19. Шлюб, сям'я, выхаванне дзяцей, апека, спадчына і г.д. ў перыяд Вялікага Княства Літоўскага і паводле Статутаў ВКЛ.
20. Эпоха мадэрна і яе рысы. Станаўленне буржуазнага грамадства і пратэстанцкі маральны ўзор.
21. Дэмаграфічны статус і месца жанчыны ў грамадстве жанчыны ў ранні Новы час.
22. Сям'я, шлюб, выхаванне дзяцей у традыцыйнай, арыстакратычнай і буржуазнай традыцыях у Еўропе ў эпоху Асветы.
23. Трансфармацыя ўкладу жыцця пад уплывам урбанізацыі і прамысловай рэвалюцыі на землях Беларусі.
24. Лад жыцця і развіцце нораваў еўрапейскага грамадства ў XIX-пачатку XX ст. Маральныя ўзоры буржуазнай эпохі.
25. Становішча жанчыны ў еўрапейскім грамадстве XIX-пачатку XX ст. Змяненне гендэрнага статуса. Жаночая эмансіпацыя і феміністкі рух.
26. Жанчыны ў перыяд Першай і Другой сусветных войн.

27. Змены ў норавах і ладзе жыцця заходняга грамадства ў першай палове XX ст. Уплыў рэалій масавага грамадства, урбанізацыі, сусветных войн, фемінісцкага руху і г.д.
28. Гендэрная спецыфіка савецкага грамадства.
29. Змяненні маральнасці, светапогляду і гендэрных статусаў ў эпоху постмадэрна, глабалізацыі і інфармацыйнага грамадства.
30. Маральнасць і норавы ў кантэксце глабальных праблем сучаснасці. Чалавек перад перспектывай будучыні.